Население этой территории, в том числе дети, использовалось в донорских целях. С этой целью был создан детский концентрационный лагерь в Красном Береге, недалеко от Жлобина. Сеть тифозных прифронтовых концентрационных лагерей была создана в гомельском регионе. Заключенные использовались как живой щит и как основной инструмент заражения бойцов Советской Армии тяжелыми вирусными заболеваниями.

Факт наличия подобных концентрационных лагерей свидетельствует о геноциде белорусского народа и о том, что у подобных преступлений были исполнители. Нацисты и коллаборационисты настолько были уверены в безнаказанности, что достаточно подробно фотографировали свои преступления, делали киносъемку вешания партизан, подпольщиков и мирного населения, сжигания жителей деревень. В кадре есть они сами. Трудности расследования преступлений против белорусского народа заключаются в том, что многие архивные материалы оказались за пределами Республики Беларусь и не все государства готовы предоставить доступ к этим архивным материалам под предлогом разных причин. На протяжении ряда лет, в Белорусском национальном техническом университете организована работа по привлечению студентов к участию в сохранении исторической памяти о событиях Великой Отечественной войны.

Студенты БНТУ воспользовались желанием их дедов и бабушек рассказать о о перенесенных ими лишениях в концентрационных лагерях [1]. Затем эта работа приобрела формат сотрудничества белорусских и российских вузов по тематике Великой Отечественной войны [2]. Ее результаты были представлены на международных конференциях в России [3] и в Беларуси [4].

**Список использованных источников:**

1. Страницы подвига. Студенты размышляют, пишут о Великой Отечественной войне (к 70-летию освобождения Беларуси). – Минск: Донарит, 2014 – 253 с.

2. Мы помним… Студенческие эссе [К 70-летию Великой Победы]. – Ижевск: Издательство Иж ГТУ им. М.Т. Калашникова, 2015 – 256 с.

3. Лойко, А.И. Студенты пишут о Великой Отечественной войне / А.И. Лойко // Великая Отечественная война: уроки истории и современность. – Краснодар: КГУКИ, 2015 – С.85-90.

4. Лойко, А.И. История Великой Отечественной войны в учебно-воспитательном процессе в высшем учебном заведении / А.И. Лойко // Патриотизм и патриотическое воспитание в контексте вызовов современности. Материалы международной научно-практической конференции. Минск 16-17 мая 2019 г. – Минск: ИПС, 2019. С. 67-70.

*В.А. Максімовіч, доктар філалагічных навук, прафесар,*
*Інстытут філасофіі НАН Беларусі, г. Минск*
valery.maximovich@gmail.com

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ ПАФАС ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ ПАЧАТКУ ХХ СТ.

Літаратура пачатку ХХ ст., імклівы ўзлёт якой у вялікай ступені абумоўлены грамадзянскай і творча-падзвіжніцкай дзейнасцю Я. Купалы, станавілася незаменнай пляцоўкай для пашырэння і ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, своеасаблівым канцэнтратам духоўнасці, пасіянарнасці, тым сэнсавым і ідэязначным кандэнсатам, якія з цягам часу набыў якасць нацыянальнага канона, эталона нацыянальнага стылю, асаблівую эстэтычную і ідэалагічную канстантнасць. Феномен



http://edoc.bseu.by

Я. Купалы насамрэч займае першынство ў нацыянальным пантэоне, у семантычнай сетцы культуры, у беларускай інтэлектуальнай прасторы.

Я. Купала з самага пачатку сваёй працы на ніве беларускага адраджэння ставіў сабе грандыёзную задачу, якая звязвалася з нацыянальным будаўніцтвам, з ліквідацыяй любых форм адчужанасці, варожасці, адасобленасці – усяго таго, што перашкаджала нацыянальнай кансалідацыі, працэсу набыцця нацыянальнай ідэнтычнасці, ідэнтыфікацыі. Узяўшы курс на культурна-духоўную кансалідацыю нацыі, на ўмацаванне ідэі аб самастойным гістарычным шляху, на адраджэнне рамантычнага пафасу пошукаў нацыянальных каранёў, Я.Купала мастацка-прапагандысцкімі сродкамі імкнуўся прывіць пачуццё асобаснай і нацыянальнай годнасці, самаўсведамлення і самасцвярджэння. «Творчасць Купалы сведчыла, – зазначае У. Гніламёдаў, – што на змену пакутніку і плакальшчыку ў беларускую літаратуру прыходзіць новы, адраджэнскі тып чалавека, які пачынае разумець сваю вартасць і маральную сілу. Гэты чалавек становіцца пратаганістам купалаўскай творчасці, вызначае яе ідэйны змест і мастацка-эстэтычныя рысы» [1, с. 20].

Паводле перакanання Я. Купалы, літаратура – гэта магутны сродак камунікацыі, наладжвання дыялогу з людзьмі, з народам, незаменная магчымасць праз мастацкае слова выказаць самае набалелае, глыбіннае, абудзіць нацыянальную свядомасць, гістарычную памяць, пазначыць магістральныя духоўныя арыенціры. Для паэта асаблівую значнасць набывала праблема адрасата. Ён імкнуўся да таго, каб яго творчасць была адэкватна ўспрынята людзьмі, якія належаць да адной этна-нацыянальнай і культурнай прасторы, каб яна стала арганічнай часткай іх жыццёвага вопыту. Паэт быў надзвычай зацікаўлены ў фарміраванні адзінай культурна-камунікатыўнай прасторы, якая выяўляе, генерыруе ідэю адзінства, узаемасувязі, пераемнасці ўсіх складнікаў сацыяльнага арганізму. Па яго глыбокім перакананні, усведамленне датычнасці кожнага суб’екта да адзінай культурнай прасторы адкрывае магчымасць дасягнуць духоўнага і светапогляднага кансенсусу, скаардынаваць свае дзеянні ў вырашэнні найважнейшых задач культурнага і дзяржаўнага будаўніцтва.

Мастацкае слова, пры адсутнасці іншых формаў грамадска-культурнай практыкі, па сутнасці, брала на сябе інтэграцыйныя функцыі, звязаныя са стварэннем нацыянальнай карціны свету, мастацкай панарамы культурна-гістарычнага працэсу, – з выяўленнем маральна-духоўных імператываў і каштоўнасцей, пазнавальна-рэфлексійных інтэнцый, з вызначэннем агульнай культурабудаўнічай стратэгіі, здольнай у перспектыве забяспечыць паўнавартаснае і поўнафарматнае існаванне ўсіх грамадскіх інстытутаў. І самае галоўнае: літаратура, мастацтва, як гэта бачылася нацыянальнаму генію, павінны заключаць у сабе кансалідуючы пачатак, спрыяць сацыяльнай, грамадзянскай актыўнасці людзей, усведамленню імі сваіх законных правоў і свабод, магчымасці творчай самарэалізацыі, што, у выніку, паслужыць узбагачэнню і павышэнню агульнай духоўнай культуры шырокіх народных мас.

Галоўную задачу паэта Я. Купала бачыць у тым, каб быць выразнікам духоўных пошукаў нацыі, абуджаць свядомасць людзей, скіроўваць іх на шлях згоды, гармоніі, праўды. Беларускі пясняр ўсведамляў вялікую сацыяльную функцыю і актыўнае, дзейснае значэнне паэзіі ў жыцці грамадства, асобую ролю мастака, творцы ў сацыякультурным будаўніцтве. Творы сапраўднага паэта – і гэта было ўласным крэда самога Купалы – павінны быць нечым большым, чым толькі фактам літаратуры. І гэта ён даказваў сваёй творчасцю, сваім жыццём. Усё, што выходзіла з-пад пяра Прарока нацыі, мела праграмную, ідэалагічную скіраванасць.

Узварухнуць, абудзіць гістарычна прыспаную свядомасць народа з тым, каб наладзіць з ім духоўную дыялагічную сувязь, заклікаць да суразмоўя, да супольнага супрацьстаяння жыццёвым злыбедам, да пошукаў светланосных шляхоў у будучыню станавілася першаступеннай задачай, якая пастаянна знаходзілася ў полі зроку мастака слова. Патрэбна было скіраваць энергію і эмоцыі людзей у кірунку сцвярджэння нацыянальнай свядомасці, самой ідэі нацыі як стваральнай сілы, разумеючы, што без

гэтага немагчыма духоўная інтэграцыя беларусаў. Выпрацоўка стрыжнявога нацыянальнага ідэалу стала злабадзённым патрабаваннем часу і аб’ектыўнай гістарычнай заканамернасцю. Толькі супольнымі намаганнямі, пры ўмове кансалідацыі ўсяго грамадства можна было дасягнуць мэты.

Грандыёзная задача, якая стаяла перад Я. Купалам, няўхільна скіроўвала яго на стварэнне канцэпцыі новага чалавека ў сувязі з праблемай нацыянальнага адраджэння. Галоўны клопат генія быў накіраваны на тое, каб раскрыць сілу, арыгінальнасць і непаўторнасць існа нацыянальнага духу, давесці тое, што чалавек каштоўны не сваёй бязлікай касмапалітычнасцю, а перш за ўсё як прадстаўнік свайго нацыянальнага этнаполіса. Таму «стварэнне» новага чалавека, па глыбокім перакананні Я. Купалы, немажліва без усведамлення апошнім сваёй ідэнтычнасці, самабытнасці і самакаштоўнасці. Передумовай ажыццяўлення гэтай задачы, якая патрабавала шмат духоўных і фізічных высілкаў, было імкненне задзейнічаць ўвесь спектр нацыянальнага жыцця, складанага і неадназначнага. Менавіта ўсведамленне датычнасці да адзінай сацыякультурнай прасторы станавілася істотнай першапрычынай духоўнай інтэграцыі грамадства, яго эвалюцыі і далучэння да заваёў чалавечай цывілізацыі. Я. А. Гарадніцкі справядліва заўважае, што ў паэзіі Я. Купалы першага дзесяцігоддзя ХХ ст. «у яшчэ большай ступені разгортваецца шматгалоссе, у якім увасабляюцца чаканні і надзеі беларусаў як нацыі, якая ў гэты час імкнецца заняць годнае месца між іншымі народамі, сцвердзіць сваё неад’емнае права на паўнату нацыянальнага быцця. Купалаўскі лірычны голас у многіх выпадках зліваецца або цесна пераплятаецца з галасамі яго шматлікіх і шматаблічных герояў, прадстаўляючы калектыўную самасвядомасць народа ў яе эстэтычных праявах» [2, с. 95].

Вялікія надзеі паэт ускладаў на моладзь, з якой ён звязваў будучыню роднага краю, выказваючы ўпэўненасць, што толькі яна абудзіць *«прыспаныя сілы»* і пакліча *«на вольны простор»*. З моладдзю звязвалася адначасова цяжкая, але і ганаровая задача зрабіць свой народ сапраўдным гаспадаром роднай зямлі, чаго не здолелі дамагчыся ранейшыя пакаленні: «Ты на бацькоўскім, моладзь, кургане // Узнясеш нездабыты пасад, // Што расточыць сваё панаванне // На ўвесь край, дзе сягне твой пагляд» [3, с. 190–191]. Верш мае шмат імператыўных канструкцый, у якіх выяўлены гістарычны аптымізм паэта ў правату святой справы адраджэння Радзімы: «Схамянайся ж ты, моладзь арліна! // Ў бок другі віхры веяць прымусь, // Бяры светач, ідзі за судзьбінай, // Ідзі з словам святым: Беларусь!» [5, с. 191].

Ужо напачатку нацыянальнага адраджэння нашы будзіцелі-пасіянарыі ўзялі на сябе адказную місію быць праваднікамі нацыянальнай ідэі, нястомна і апантана сілай палымянага мастацкага слова абуджалі ў людзях пачуццё адзінакрэўнасці, духоўнай, чалавечай і нацыянальнай салідарнасці, узаемадапамогі і ўзаемападтрымкі, заклікалі паважліва і беражліва адносіцца да нацыянальных і гістарычных святынь. Высока ацэньваючы падзвіжніцкую ролю нашых пачынальнікаў, якія закладвалі падмурак новай беларускай літаратуры і намацвалі перспектыву яе далейшага развіцця, В. Жураўлёў піша: «Абапіраючыся на традыцыі, яны (пачынальнікі. – *В.М.*) добра адчулі, што пры самых шырокіх і разнастайных сувязях і ўзаемадачыненнях з жыццём мастацкае і літаратурнае слова можа паўнапраўна жыць і развівацца, арыентуючыся не на паказ і ўхвалу барацьбы, калатнечы і людской размежаванасці, а на ўмацаванне духоўнай еднасці і братэрскай суладнасці» [4, с. 53].

Творчасць класікаў беларускай літаратуры ў сучасных умовах уяўляе сабой незаменны рэсурс для прадуцыравання нацыянальнай аксіялогіі, каштоўнасна-ўніверсальных маральна-духоўных крытэрыяў і нормаў, культурна-светапоглядных патэрнаў, якія грунтуюцца на правераных часам жыццятворчых імператывах, перакананнях і выступаюць у якасці дзейсных складнікаў і нацыянальнай культурнай прасторы як ствральнага адзінства, і адметнага цывілізацыйнага самавыяўлення. Класічная літаратура ўяўляе сабой адну з дзеючых формаў «анталагічнай» рэкультывацыі

– узнаўлення, узбагачэння, рэгуляцыі падсістэм сацыяльнага быцця, выступае складовай часткай механізму ўзнаўлення грамадскага светапогляду і культуры, маральнай рэгуляцыі, станаўлення, узнаўлення і трансляцыі гісторыка-культурных і камунікатыўных практык, нацыянальных формаў і відаў жыццядзейнасці. Як значны, асноватворны складнік грамадска-пераўтваральнай дзейнасці, выразнік каштоўнаснага стрыжня грамадскага быцця яна выступае дзейсным фактарам асобаснага і нацыянальнага самавызначэння, камунікацыі, сацыяльнай кансалідацыі, заснаванай на далучанасці да адной культурнай фармацыі, на ўсведамленні адзінага культурна-цывілізацыйнага кантэксту, што спрыяе гарманізацыі сацыяльнага асяроддзя, фарміраванню пачуцця калектыўнай адказнасці, гонару за грамадзянскае дачыненне да супольнай гісторыка-культурнай спадчыны.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Гніламёдаў, У.В. Янка Купала: Жыццё і творчасць. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 238 с.
2. Гарадніцкі, Я. А. Па абодва бакі тэксту: увасабленні, інтэрпрэтацыі – Мінск : Бел. навука, 2018. – 272 с.
3. Купала, Я. Поўны збор твораў. У 9 т., 10 кн. – Т.3. Вершы, пераклады 1911–1914. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 342 с.
4. Жураўлёў, В. П. У пошуках духоўных ідэалаў: на матэрыяле беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст. / Нац. Акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы: Пад рэд. У. В. Гніламёдава. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 191 с.

*И.А. Мамайко, соискатель кафедры*
*историко-культурного наследия Беларуси,*
*РИВШ, г. Минск,*
*mamayko.1974@mail.ru*

# ОБРАЗОВАНИЕ, ОРГАНИЗАЦИОННО-ПРАВОВЫЕ ФОРМЫ СТАНОВЛЕНИЯ И РАЗВИТИЯ МИЛИЦИИ БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЧЕСКАЯ ПАМЯТЬ, ПРЕЕМСТВЕННОСТЬ И ПАТРИОТИЗМ

В Российской империи основными функциииями полиции являлись охрана общественного порядка и борьба с преступностью. В феврале 1917 года на смену полиции пришла сначала народная милиция, основанная Временным правительством, а затем – советская рабоче-крестьянская милиция Российской Социалистической Федеративной Советской Республики (РСФСР), которая с самого начала строилась как классовый орган диктатуры пролетариата, поскольку «в этом состоит её действительная сущность, в этом она коренным образом отличается от буржуазной полиции» [1, с. 42].

28 октября (10 ноября) 1917 года Народный комиссариат внутренних дел Российской Советской Республики (после Октябрьской революции 1917 года на II Всероссийском съезде Советов было объявлено о создании Российской Советской Республики, а в Конституции 1918 года Россия получила официальное название - Российская Социалистическая Федеративная Советская Республика) издал постановление «О рабочей милици», которое объявляло образование милиции как исполнительного органа местных Советов рабочих и солдатских депутатов. В соответсвии с данным постановлением на местах образовывались вооруженные формирования трудящихся и под иными названиями: дружина охраны, отряды порядка и другие [1, с. 12].

Основным правовым документом, который регламентировал организацию и деятельность советской милиции как штатного государственного органа охраны общественного порядка, являлась инструкция «Об организации советской рабоче-